# ВОДЗЫЎ АФІЦЫЙНАГА АПАНЕНТА

па дысертацыі Носік Алесі Анатольеўны «Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

1. **Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны.**

На падставе ацэнкі фармулёвак аб'екта і прадмета, мэты, пастаўленых для яе вырашэння задач, выкарыстанай методыкі, а таксама атрыманых вынікаў даследавання, робім заключэнне, што дысертацыя Алесі Анатольеўны Носік «Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне» адпавядае галіне навукі (філалагічныя навукі) і заяўленай спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова.

2. **Актуальнасць тэмы дысертацыі.**

У сучасным мовазнаўстве апошніх двух дзесяцігоддзяў асобую актуальнасць набылі даследаванні, звязаныя з функцыянаваннем беларускай літаратурнай мовы ў нашым двухмоўным грамадстве. Праблема суадносін катэгарыяльных паняццяў «эмоцыя і мова» становіцца адной з найбольш актуальных тэм лінгвістычных даследаванняў не толькі ў айчыннай, але і ў замежнай філалогіі. У межах новай навуковай парадыгмы, якая вылучыла на пярэдні план антрапацэнтрычны, функцыянальны, кагнітыўны і дынамічны падыходы, паўстала вострая неабходнасць даследавання намінацый эмацыянальнай сферы чалавека, якія не толькі істотным чынам характарызуюць мову, але і маюць непасрэднае дачыненне да асобы, грамадства і дзяржавы. Зварот да эмацыянальнай сферы з'яўляецца актуальным і абумоўлены феноменам эмоцый і іх важнай роллю ў кагнітыўнай дзейнасці чалавека, а таксама ўзрастаючай цікавасцю даследчыкаў да ўзаемасувязі эмацыянальнага і рацыянальнага пачаткаў у працэсе пазнання індывідам навакольнай рэчаіснасці. У гэтым плане актуальнасць дысертацыйнага даследавання вызначаецца важнасцю феномена эмацыянальнасці, які займае цэнтральнае месца ў нацыянальнай канцэптасферы любога этнасу, і неабходнасцю яго ўсебаковай характарыстыкі.

Актуальнасць праведзенага даследавання заключаецца яшчэ і ў тым, што яно выканана ў русле больш глыбокага і дэталёвага апісання эмацыянальных намінацый па прычыне іх глыбокай змястоўнасці, шырокай прадстаўленасці ў розных маўленчых сітуацыях, а таксама далейшай

распрацоўкі новых прынцыпаў і метадаў сістэмнага вывучэння моўных сродкаў выражэння эмацыянальнасці, выяўлення іх месца і ролі ў лексічным складзе беларускай мовы.

Несумненная актуальнасць дысертацыйнай работы Носік А. А. заключаецца ў звароце даследчыцы да эмацыянальнага кантынуума і выяўлення лексіка-тэматычных груп псіхалагічных намінацый, устанаўлення іх тыпалагічных і спецыфічных асаблівасцей, а таксама вызначэння характару функцыянавання ў беларускім мастацкім дыскурсе.

3. **Ступень навізны вынікаў, атрыманых у дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону.**

Навуковая навізна праведзенага Носік А. А. даследавання базіруецца на распрацаванай метадалогіі комплекснага падыходу да аналізу лексікі эмацыянальнай сферы і ўстанаўлення класіфікацыйных тыпаў пеяратыўных, меліяратыўных і сінкрэтычных пачуццёва-псіхічных намінацый беларускай мовы. Атрыманыя ў рабоце вывады і асноўныя вынікі, а таксама вынесеныя на абарону палажэнні з'яўляюцца, бяспрэчна, новымі і фактычна сведчаць аб паспяховай рэалізацыі абранага падыходу да вывучэння эмацыянальна-пачуццёвай прасторы чалавека.

Праведзенае даследаванне ўносіць істотны ўклад у распрацоўку і апрабацыю новага для беларускай лінгвістыкі навуковага напрамку – эматыялогія. Напрамку, які разам з улікам даных кагнітывістыкі, псіхалогіі і мовазнаўства вывучае ролю эмоцый у дзейнасці чалавека, спецыфіку іх вербалізацыі, сувязі эмоцый і мовы, ролю эмоцый у камунікацыйных і маўленчых паводзінах, а таксама займаецца распрацоўкай лінгвістычных і кагнітыўных тэорый эмацыянальнасці. Выяўленая спецыфіка рэпрэзентацыі субстантыўных, ад'ектыўных і дзеяслоўных эмацыянальных намінацый садзейнічае пашырэнню тэарэтычных аспектаў канцэптуалізацыі эмоцый і іх важнай ролі ў моўнай карціне свету. Атрыманыя ў рабоце вынікі ўносяць значны ўклад у далейшае вырашэнне задач сучаснай лексікалогіі, семасіялогіі і лексікаграфіі, а таксама ў фарміраванне грунтоўнай тэарэтычнай базы па вызначэнні асноўных прынцыпаў і механізмаў сувязі псіхалагічных і моўных структур.

Да бяспрэчна новых належыць аднесці навуковыя вынікі, якія ўносяць уклад у тэорыю і практыку айчыннай лексікаграфіі. Упершыню створаны на аснове даволі рэпрэзентатыўнага фактычнага матэрыялу «Тлумачальны слоўнік намінацый эмацыянальнай сферы чалавека», які можна лічыць арыгінальнай аўтарскай спробай лексіка-тэматычнага аб'яднання субстантыўных, ад'ектыўных і дзеяслоўных лексічных адзінак. У слоўніку

прадстаўлены не толькі лексічныя адзінкі эмацыянальнай сферы, а таксама дэфініцыі да іх і ілюстрацыі (экзэмпліфікацыі) з твораў мастацкай літаратуры. Акрамя таго, тут адлюстраваны мадэлі семантычнай дэрывацыі, што выразна прадэманстраваны першаснымі і другаснымі лексіка-семантычнымі варыянтамі, сувязь паміж якімі ў слоўніку абазначаецца спецыяльным знакам (→).

Несумненнай навізной характарызуюцца выяўленыя прадметна-тэматычныя аб’яднанні адмоўных (*гора, гнеў, агіда, нянавісць, пагарда, віна, сорам, страх*) і станоўчых (*радасць, цікавасць, здзіўленне*) эмацыянальных станаў. Упершыню на аснове распрацаванай метадалогіі ўстаноўлены семантычныя мадэлі, па якіх у залежнасці ад суадносін зыходных і рэцыпіентных лексіка-семантычных варыянтаў утвараюцца другасныя ЛСВ неэмацыянальнай сферы.

Адзначаныя навуковыя вынікі, атрыманыя саіскальнікам, дазваляюць ахарактарызаваць дысертацыю А. А. Носік як актуальнае і арыгінальнае навуковае даследаванне, асноўныя вывады якога ўтрымліваюць новыя палажэнні, важныя як для сучаснага мовазнаўства наогул, так і для беларусістыкі.

4. **Абгрунтаванасць і дакладнасць вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі.**

Абгрунтаванасць і дакладнасць атрыманых у дысертацыі вывадаў забяспечваецца, перш за ўсё, дастатковай паўнатой рэпрэзентатыўнага моўнага матэрыялу. Фактагічная база даследавання складае звыш 1100 лексічных адзінак беларускай мовы, засведчаных у больш чым 2800 тэкставых фрагментах. Высокая ступень аргументаванасці вынікаў забяспечваецца тэарэтычнай базай даследавання, якая базіруецца на глыбокім веданні і мэтанакіраваным аналізе навуковых матэрыялаў, зробленых замежнымі і айчыннымі вучонымі па тэме дысертацыі (293 пазіцыі). Пры рашэнні пастаўленых задач у ходзе даследавання прымяняліся дэфініцыйны, кантэкстуальны і дэрывацыйна-семантычны метады, а таксама элементы кампанентнага і статыстычнага аналізу. Звяртае на сябе ўвагу прадуктыўнае выкарыстанне аўтарам дысертацыі падлікаў па колькасным размеркаванні негатыўных намінацый эмацыянальнга стану чалавека. Нарэшце, трэба таксама адзначыць наяўнасць Дадатку А «Тлумачальны слоўнік намінацый эмацыянальнай сферы чалавека», які дакладна ілюструе прэзентабельнасць фактычнага матэрыялу.

Усё адзначанае дазваляе ацаніць вывады і рэкамендацыі, атрыманыя саіскальнікам вучонай ступені, як аб’ектыўныя, абгрунтаваныя, даставерныя.

5. **Навуковая, практычная і эканамічная значнасць вынікаў і асноўных навуковых палажэнняў дысертацыі.**

Навуковая значнасць дысертацыйнай работы Носік А. А. вызначаецца сваім укладам у распрацоўку праблем узаемадзеяння лагічнага і семантычнага ўзроўняў мыслення ў працэсе моўнай аб'ектывацыі эмоцый і пачуццяў. Праводзіцца выяўленне нацыянальна-культурных асаблівасцей псіхалагічных намінацый беларускай мовы, якія з'яўляюцца паказчыкам моўнай карціны свету і сведчаць пра сувязі і заканамернасці выкарыстання канкрэтных і прадметных паняццяў для абазначэння абстрактых вобразаў, псіхалагічных станаў і адчуваянняў у лексіка-тэматычных групах субстантыўнай, ад'ектыўнай і дзеяслоўнай лексікі. Асноўныя палажэнні даследавання, вывады і практычныя матэрыялы могуць атрымаць выкарыстанне пры правядзенні навуковых даследаванняў, а таксама далейшай распрацоўцы тэарэтычных праблем катэгорыі эмацыянальнасці.

Практычная значнасць дысертацыйнага даследавання відавочная і адназначная. Навуковыя выдады, тэарэтычныя абагульненні, даследаваны фактычны матэрыялы дысертацыі могуць выкарыстоўвацца ў навучальным працэсе пры выкладанні беларускай мовы, пры распрацоўцы вучэбных дапаможнікаў, напісанні дыпломных і магістарскіх работ.

Адзначанае пацвярджае сацыяльную і эканамічную значнасць дысертацыі Носік А. А., паколькі матэрыялы даследавання накіраваны на забеспячэнне патрэб сучаснай моўнай і вучэбнай практыкі ў нашай краіне. Работа змяшчае шэраг важных фактаў, улік якіх можа прывесці да ўдасканалення практычных распрацовак і навучальных планаў. Улік шэрагу важных фактычных даных дысертацыі зможа прывесці да паляпшэння слоўнікавых артыкулаў, сістэматызацыі асобных дэфініцый у тлумачальных слоўніках, а таксама пры складанні тэматычных, ідэаграфічных і перакладных слоўнікаў.

Акрамя таго, належыць падкрэсліць наяўнасць у дысертацыі Дадатку Б, у якім змяшчаецца Акт аб укараненні вынікаў даследавання ў навучальны працэс УА «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт», што істотна ўплывае на ацэнку практычнай значнасці ў сферы адукацыі і сучаснай навукі.

6. **Апублікавнасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку.**

Вынікі дысертацыйнага даследавання дастаткова прадстаўлены ў навуковым друку. Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання знайшлі адлюстраванне ў 20 работах аўтара, у тым ліку ў 5 артыкулах у часопісах, уключаных у пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйнага даследавання, у 7 артыкулах у

зборніках навуковых прац і 8 публікацыях у зборніках матэрыялаў канферэнцый. Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў складае звыш 6 аўтарскіх аркушаў.

7. **Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК.**

Афармленне дысертацыі і аўтарэферата дысертацыі, а таксама спіса выкарыстанай літаратуры адпавядаюць патрабаванням Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь, якія ўтрымліваюцца ў пп. 24-26 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь.

Аўтарэферат адпавядае зместу дысертацыі, вынікам і асноўным палажэнням, якія выносяцца на абарону. У тэкстах дысертацыі і аўтарэферата выкарыстаны добры навуковы стыль беларускай літаратурнай мовы з правільным прымяненнем тэрміналогіі сучаснага мовазнаўства.

8. **Недахопы дысертацыі.**

Верагоднасць і абгрунтаванасць асноўных палажэнняў і вывадаў дысертацыі Носік А. А. не выклікае сумненняў, таксама станоўча трэба ацаніць навуковую навізну работы, яе практычную і сацыяльна-культурную значнасць. Аб’ектыўнасць і карэктнасць адбору фактычнага матэрыялу, навуковы ўзровень і паўната яго інтэрпрэтацыі дастаткова высокія. Таму прыведзеныя ніжэй заўвагі і каментарыі з’яўляюцца разважаннямі дыскусійнага характару адносна некаторых яе палажэнняў, а таксама звязаны з аўтарскай інтэрпрэтацыяй асобных моўных фактаў і тэрмінаў, якія патрабуюць дадатковага тлумачэння.

1. У практычных главах даследавання Вамі аналізуецца эмацыянальны кантынуум, які закранае антрапамарфічную сферу і служыць для намінацый чалавека. Практычна ўсе віды метафары, як вядома, засноўваюцца на пэўных падабенствах. Пры метаніміі прымета падабенства асноўваецца на сумежнасці прадметаў. Сказанае пацвярджаецца вялікай колькасцю прыведзеных у дысертацыі ілюстрацый.

На Ваш погляд, адзначаная эмацыянальна-пачуццёвая вобразнасць больш характэрна негатыўным ці пазітыўным намінацыям? І ў чым іх спецыфіка?

2. Даволі актуальным з’яўляецца зварот дысертанткі да пытання аб мадэляванні другасных намінацый унутранага стану чалавека і выяўлення тыпалагічных семантычных мадэлей. Зразумела, што такія намінацыі значна папоўнілі корпус эмацыянальных найменняў.

У той жа час хацелася б пачуць адказ на пытанне аб дзеянні зваротнай (абарачальнай) мадэлі семантычнай дэрывацыі. Якія тэматычныя групы

лексікі пашырылі свой склад за кошт намінацый эмацыянальных станаў і пачуццяў? І які іх колькасны склад?

3. Пры даследаванні сэнсавых адносін паміж рознымі значэннямі эмацыянальных намінацый аўтар у некаторых выпадках звяртаецца да гіпаніміі і тлумачыць узнікненне другасных ЛСВ як вынік дзеяння гіпанімічнай мадэлі.

Адсюль пытанне: у якіх тэматычных групах найбольш яскрава выяўляецца гіпанімія і ў чым яе асаблівасць?

4. Тэкст дысертацыі і Дадатак А да яе сведчаць пра шырокую прадстаўленасць у эмацыянальным корпусе розных форм деяслоўных намінацый.

Скажыце, калі ласка, як праводзіўся падлік такіх дзеясловаў? Ці ўлічваўся факт тоеснасці лексічных значэнняў пры, напрыклад, разыходжаннях у трыванні?

Выказаныя заўвагі не зніжаюць высокай вартасці дысертацыі. Іх у многіх выпадках можна лічыць разважаннямі апанента пра складанасць функцыянавання эмацыянальных найменняў у беларускай мове і пажаданнем дысертанту ў яго будучай навуковай дзейнасці.

9.**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка навуковай ступені, на якую ён прэтэндуе.**

Саіскальнік навуковай ступені Алеся Анатольеўна Носік з'яўляецца высокакваліфікаваным спецыялістам у галіне філалагічных навук. Праведзенае даследаванне з'яўляецца сведчаннем таго, што яго аўтар валодае метадалогіяй навуковага даследавання, карэктна праводзіць інтэрпрэтацыю атрыманых даных. Дысертацыя змяшчае новыя вынікі, якія ў сукупнасці дазваляюць заключыць, што навуковая кваліфікацыя саіскальніка адпавядае вучонай ступені кандыдата філалагічных навук, на якую ён прэтэндуе.

**Заключэнне.**

Дысертацыя А. А. Носік «Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне» з'яўляецца кваліфікацыйнай навуковай працай, выкананай пад кіраўніцтвам доктара філалагічных навук, прафесара В. Д. Старычонка; змест дысертацыі адпавядае спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова; прадстаўляе сабой завершанае комплекснае даследаванне, якое ўтрымлівае новыя, навукова абгрунтаваныя вынікі, мае тэарэтычную і практычную значнасць.

Азнаямленне з дысертацыяй Носік А. А. дазваляе гаварыць аб дастатковай кампетэнтнасці і навукой падрыхтаванасці даследчыка, які змог вырашыць актуальную навуковую праблему. У адпаведнасці з пунктамі 20 і

21 Палажэння аб прысуджэнні ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь рэкамендуецца прысудзіць Носік Алесі Анатольеўне вучоную ступень кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова **за:**

– сістэматызацыю найбольш поўнага корпуса дзеяслоўных, субстантыўных і ад’ектыўных намінацый са значэннем унутранага стану чалавека (1100 лексічных адзінак, засведчаных у 2800 тэкставых фрагментах);

– стварэнне першага ў лексікаграфіі «Тлумачальнага слоўніка намінацый эмацыянальнай сферы чалавека»;

– устанаўленне спецыфікі функцыянавання субстантыўных, ад’ектыўных і дзеяслоўных намінацый у беларускім мастацкім дыскурсе;

– правядзенне класіфікацыі 8 негатыўных эмацыянальных намінацый, вылучэнне груп найменняў эмоцый *гора, гневу, агіды, нянавісці, пагарды, страху, віны* і *сораму* і іх колькаснай прадстаўленасці (203 субстантывы, 155 ад’ектываў, 312 деясловаў) у эмацыянальным кантынууме беларускай мовы;

– вылучэннне 3 лексіка-тэматычных груп станоўчай паняційнай сферы (254 найменні), якія аб’ядноўваюцца агульным інварыянтным значэннем ‘стан чалавека, звязаны з адчуваннем *радасці, шчасця, задавальнення, сімпатыі*’ і ў канкрэтных маўленчых сітуацыях атрымліваюць больш дакладнае, спецыялізаванае значэнне;

– устанаўленне спецыфікі семантычнай дэрывацыі і асноўных семантычных мадэлей псіхалагічнага кантынуума, у аснову якіх пакладзены характар суадноснасці зыходнага і вытворнага лексіка-семантычных варыянтаў і тэматычная прадстаўленасць тых ці іншых намінацый у зыходнай і рэцыпіентнай паняційных сферах.

Загадчык аддзела сучаснай беларускай мовы
Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа
ДНУ«Цэнтр даследаванняў беларускай культуры,
мовы і літаратуры НАН Беларусі»
доктар філалагічных навук, дацэнт В. П. Русак

20.06.2024 г.

Подпіс В.П. Русак
СВЕДЧУ
Вядучы спецыяліст па кадрах
(В.М. Мітар)
20 06 2024 г